УДК 069.01

# ПРАДМЕТЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З ДЗЕЙНАСЦЮ ЦАРКВЫ АБ'ЯДНАННЯ, У ФОНДАХ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

**Ціхамìраў Андрэй Уладзіміравіч**
Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі (г. Гродна, Беларусь)

*У артыкуле коратка апісваецца дзейнасць арганізацый Царквы Аб'яднання ў Беларусі і музейныя прадметы, звязаныя з гэтым рэлігійным рухам у фондах Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі.*

Дзейнасць новых рэлігійных рухаў у Беларусі з канца 1980-х гадоў з'яўляецца цікавым і важным даследчыцкім полем для рэлігіязнаўцаў, гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў і прадстаўнікоў іншых дысцыплін. Палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя змены, якія адбывалі ў той час былі цесна звязаныя з актыўнасцю веруючых розных новых рэлігійных рухаў. Невялікая частка гэтых рэлігійных групаў мела пэўную гістарычную традыцыю на беларускіх землях, але большасць з іх была цалкам новай з'явай для Беларусі.

Сярод новых рэлігійных рухаў была таксама Царква Аб'яднання, найбольшая актыўнасць якой была асабліва прыкметнай у другой палове 1990-х – на пачатку 2000-х гг. Царква Аб'яднання (ці Царква Уніфікацыі) (Unification Church) (пачатковая назва – Асацыяцыя Святога Духа за аб'яднанне сусветнага хрысціянства) была заснавана Сан Мён Мунам (1920–2012) у 1954 г. у Сеўле (Паўднёвая Карэя). У 1957 г. філіялы арганізацыі дзейнічалі ўжо ў 30 гарадах Карэі, у 1958 г. першы місіянер быў накіраваны ў Японію, у 1959 г. – у ЗША. На пачатку 1990-х гадоў арганізацыя дзейнічала ў 130 краінах, маючы шырокую сетку міжнародных афіліяваных струк-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тур: Міжнародны фонд дапамогі і дружбы, “Хрысціяне свету за адзінства і сацыяльныя дзеянні”, Міжнародны культурны фонд, Міжнародная канферэнцыя па адзінстве навук, “Акадэмія прафесароў за мір ва ўсім свеце”, Міжнародны рэлігійны фонд, Асамблея рэлігій свету, Канферэнцыя для свяшчэннаслужыцеляў розных веравызнанняў, Міжнародная федэрацыя перамогі над камунізмам, Федэрацыя грамадзян за аб’яднанне Айчыны (яе мэтай з’яўляецца ўз’яднанне Карэі), Федэрацыя жанчын за мір ва ўсім свеце, Вузаўская асацыяцыя па вывучэнні Прынцыпа (The Collegiate Associatioп for the Research of Priпcipies) (CARP, C. A. R. P. Internatioпal) і шэраг іншых. Арганізацыя з’яўляецца таксама ўласнікам прадпрыемстваў, банкаў, вышэйшых навучальных устаноў, друкаваных і электронных выданняў і інш. [4, с. 522–523].

У Беларусі ў 1990-х гадах арганізацыя дзейнічала галоўным чынам як Вузаўская асацыяцыя па вывучэнні Прынцыпа (пазней – Студэнцкая асацыяцыя C.A.R.P.) (атрымала дзяржаўную рэгістрацыю 11 мая 1992 г.), але таксама як аб’яднанні з іншымі назвамі: “Моладзь за маральнае і культурнае адраджэнне”, “Магілёўскае аб’яднанне “Новая Надзея””, “Федэрацыя сем’яў за аб’яднанне і мір ва ўсім свеце”, “Шлях XXі”. У 1999 г. яны ўсе не прайшлі перарэгістрацыю ў дзяржаўных органах Беларусі і спынілі дзейнасць. Таксама было адмоўлена ў рэгістрацыі Царквы як рэлігійнага аб’яднання [2; 3, с. 172-174, 227-231].

Царква Аб’яднання мае сінкрэтычнае навучанне, якое спалучае элементы хрысціянства, будызму, канфуцыянства, акультных вучэнняў, карэйскіх традыцыйных вераванняў, спірытычныя практыкі і асабістыя погляды яе заснавальніка, які згодна з навучаннем арганізацыі з’яўляецца “месіяй” [5, p. 46-68]. Члены Царквы намагаюцца “добра працаваць у імя Бога і для дабрабыту чалавецтва, адмаўляючыся на карысць Царквы ад уласнай маёмасці, асабістых патрэбаў і інтарэсаў, ацэньваючы іх як эгаістычныя, палягаючы ва ўсім на навучанне Сан Мён Муна” [4, с. 523]. Важную ролю ў кульце арганізацыі адыгрывае ўдава Муна Хак Хакча Хан Мун (нар. 1943). Дзейнасць Царквы вядомая масавымі шлюбамі яе чальцоў, якія праводзіліся заснавальнікам і яго жонкай, фінансавымі, палітычнымі і побытавымі скандаламі, крытыкай з боку іншых рэлігійных арганізацый і навукоўцаў.

У фондах Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі захоўваецца шэраг прадметаў, якія звязаныя з дзейнасцю гэтага рэліігйнага руху ў Беларусі. Першыя з іх з’явілюя ў 1986 г., калі будавалася адмысловая выстава “Рэлігійна-містычныя пошукі моладзі Захаду”, дзе між іншым былі прадстаўлены фотакопіі здымкаў лідэра Царквы, яго жонкі, некаторых цырымоній. Гэтыя прадметы былі перададзены ў Гродна з Львоўскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі і атэізму. Па словах старшага навуковага супрацоўніка І. Г. Ганчарука цікавасць публікі да выставы была значнай. Большасць жа прадметаў паступіла ўжо ў 1990-я – на пачатку 2000-х гг.

На канец 2021 г. у фондах музея захоўваецца 87 прадметаў па дадзенай тэматыцы. Яны размешчаныя ў васьмі калекцыях. Больш за ўсё змяшчае калекцыя дакументаў, дзе захоўваюцца арыгіналы і копіі матэрыялы, якія асвятляюць дзейнасць Студэнцкай асацыяцыі C.A.R.P. у Гродзенскай вобласці ў 1995–1999 гг. Сярод іх – праграмы і запрашэнні на мерапрыемствы, анкеты для моладзі, статуты, справаздачы, выявы заснавальніка арганізацыі і яго жонкі, запрашэнні на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

“святы шлюб”, матэрыялы “Федэрацыі сем’яў за мір ва ўсім свеце”. У калекцыі ліставых друкаваных выданняў знаходзяцца ўлёткі і буклеты, сярод якіх цікавасць уяўляюць буклеты з праграмай “Нядзельнага сямейнага ўніверсітэта” (гэты цыкл мерапрыемстваў праводзіўся ў Гродне ў 1997 г.). У калекцыі перыядычнага друку – газеты, часопісы і булеты, якія выдаваліся Царквой і яе арганізацыямі ў Мінску, Маскве і С.-Пецярбургу ў 1996-2003 гг. У фондах захоўваюцца таксама кнігі і брашуры з тэкстамі заснавальніка руху і яго жонкі, між іншым адзін з галоўных твораў “Принцип Объединения в основных чертах”. Цікавасць прадстаўляюць таксама рукапіюы канспектаў заняткаў па “Прынцыпе” у гродзенскай арганізацыі C.A.R.P. (1995–1999 гг.). У калекцыі фалерыстыкі захоўваецца значок Сусветнай студэнцкай хрысціянскай федэрацыі, а ў калекцыі вексілалогіі – папяровая эмблема конкурсу малюнкаў “СПИД от реальности не уйти” (яго праводзілі члены арганізацыі ў Гродне ў 1996 г.). Важнай візуальнай крыніцай з’яўляюцца фатаграфіі. Сярод іх – выявы заснавальніка руху і яго жонкі (выкарыстоўваюцца прыхільнікамі ў культавай дзейнасці), фатаграфія для спецыяльнай анкеты прыхільніцы арганізацыі (у практыцы гэтай Царквы іх выкарыстоўваюць для падбору будучых мужа і жонкі, якіх атрымліваюць “святое блаславенне” падчас цырымоніі “святога шлюбу”) і фотакопіі, выкананыя для выставы 1986 г. Адзін з фотаздымкаў Муна і Хак Хакча Хан Мун мае на адваротным баку надпіс на японскай мове, які можна перакласці наступным чынам: “Не адхіляйцеся ад свайго лёсу” (пераклад д-ра філалогіі Сіёры Кіёсава з Універсітэта Хакайда) ці “Нельга адмаўляцца ад Божага дару” (пераклад магістра філалагічных навук Ванг Тао, старшага выкладчыка кафедры перакладу і міжкультурных камунікацый Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы). Сэнс гэтага надпіюу можна патлумачыць наступным чынам: “Божы дар [у любым выпадку павінен быць] рэалізаваны” ці “Божай волі [маецца на ўвазе стварэнне рэлігійнай арганізацыі] – быць!” (тлумачэнне Ванг Тао) [1].

Музейныя прадметы, звязаныя з дзейнасцю Царквы Аб’яднання – гэта вартыя ўвагі крыніцы для даследчыкаў, якія дазваляюць больш падрабязна вывучыць дадзеную тэму, асаблівасці арганізацыйнай і культавай практыкі, спосабы распаўсюджвання сярод насельніцтва (галоўным чынам – моладзі). Гэтыя матэрыялы таксама можна выкарыстоўваць у асветнай дзейнасці, асвятленні ролі новых рэлігійных рухаў у Беларусі.

## Літаратура

1. Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі. – Навуковы пашпарт № 182609. Ціхаміраў А. У. [складальнік].

2. Мартинович, О. Л. Деятельность Движения Объединения Сан Мен Муна в Республике Беларусь [Электронны рэсурс] // Журнал “Ступени”. Архив номеров. – Рэжым доступу: https://minds.by/zhurnal-stupeni/arhiv-nomerov-za-2001-god/stupeni-3-4-razgovor-o-vere/deyatelnost-dvizheniya-obedineniya-san-men-muna-v-respublike-belarus#.Yc6mjClvU0M. – Дата доступу: 31. 12. 2021.

3. Неокульты: «новые религии века»? / под ред. А. С. Майхровича. – Минск: Четыре четверти, 2000. – 240 с.

4. Христианство: Словарь / под общ. ред. Л. Н. Митрохина и др. – Москва: Республика, 1994. – 559 с.

5. Chryssides, G. D. The Advent of Sun Myung Moon. The Origins, Beliefs and Practices of the Unification Church / G. D. Chryssides. – London: Macmillan, 1991. – 230 p.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова